14.02.2018 / 20:46

# Намеснік дэкана БДУ, які параіў студэнтам галасаваць датэрмінова або ісці гандляваць абуткам на Ждановічах: «Гэтыя дзеці дрэнна выхаваныя»

**Студэнты механіка-матэматычнага факультэта БДУ скардзяцца ў сацсетках: нібыта намеснік дэкана заклікаў іх прыняць удзел у датэрміновым галасаванні з феерычнай аргументацыяй. «Наша Ніва» вырашыла спраўдзіць цытату ў самога выкладчыка.**



Валерый Курсаў.

**Па словах студэнтаў, намеснік дэкана па вучэбнай працы Валеры Курсаў сказаў наступнае: «Ці вы ідзяце галасаваць датэрмінова, ці вы пойдзеце гандляваць абуткам на Ждановічы».**

Валеры Курсаў заявіў «Нашай Ніве», што «студэнты перакручваюць» яго словы.

Але Курсаў не адмаўляе, што сапраўды заклікае студэнтаў галасаваць датэрмінова і тлумачыць чаму:

**«Я проста папрасіў студэнтаў. Студэнты першага курса карыстаюцца ўсякімі ільготамі. Мы іх засяляем у інтэрнат — усіх студэнтаў з іншых гарадоў. Яны жывуць авансам. Да Новага года ім прызначаюць стыпендыю — ні за што. Яны яшчэ нічога не здалі.**

Яны вучацца ў дзяржаўным ВНУ, карыстаюцца льготамі. У нас студэнты старэйшых курсаў незадаволеныя тым, што іх з высокімі баламі не засяляюць у інтэрнат, бо нібыта трэба моладзь у мэтах адаптацыі засяліць у інтэрнат. А вы ведаеце кошты на здымнае жыллё ў Мінску, — распавёў Курсаў. —

І вось гэтыя дзеці, якія, напэўна, прывыклі грэбліва ставіцца да сваіх школьных выкладчыкаў, намагаюцца распаўсюдзіць гэтае стаўленне да выкладчыкаў ужо ў ВНУ.

**Яны кепска выхаваныя сваімі бацькамі. І калі я звяртаюся да іх з просьбай выканаць грамадзянскі абавязак, яны пачынаюць тут гуляць у рэвалюцыянераў…**

Хай яны ідуць [галасаваць] 18-га, я не ведаю. Як хочуць».

Курсаў таксама растлумачыў, чаму «грамадзянскі абавязак» — гэта менавіта датэрміновае галасаванне.

**«Бо шмат хто з'едзе да бацькоў. І я баюся, што абавязак яны ўвогуле не выканаюць. А гэта будзе вельмі кепска. Бо дзяржава робіць для іх вельмі шмат. Вось у галоўным корпусе адрамантавалі сталовую. Цудоўная**

**сталовая, там цяпер танна і добра кормяць. То бок, усё для студэнтаў. І цяпер мы чакаем сіметрычнага адказу на ўсе гэтыя дзеянні».**

УШ

## ЧЫТАЙЦЕ ЯШЧЭ


«Часта ламаў рукі і ногі». Пяць фактаў пра новага пасла Беларусі ў Расіі Дзмітрыя Крутога 18

Лукашэнка хоча пакінуць у сябе расійскія С-400 і «Іскандэры»

Пуцін накрыўся падчас парада. Гэта выклікала новыя абмеркаванні яго здароўя

Лукашэнка спытаў вайскоўцаў: Якая вайна будзе ў Беларусі, калі не дай бог?